Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 43 (112)
ЧАЦВЕР
22
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

РАЗГАРНУЦЬ АГІТАЦЫЮ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

За апошнія дні па большасці выбарчых акруг прайшлі прадвыбарчыя нарады ўпаўнаважаных. На ўсіх прадвыбарчых нарадах упаўнаважаных былі аднадушна падтрыманы кандыдаты Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

На большасці нарад упаўнаважаных выступілі кандыдаты ў дэпутаты, якія расказалі свае аўтабіяграфіі і далі слова быць да канца адданымі народу, абараняць яго інтарэсы, быць вернымі соцыялістычнай радзіме, партыі большэвікоў і правадыру народаў — вялікаму Сталіну.

Гэта не былі напышлівыя фразы хлусні і ашуканства буржуазных паслоў. Гэта былі шчырыя, простыя, палітычна-завостраныя прамовы радавых рабочых, сялян і інтэлігенцыі, якіх народ вылучае ў соцыялістычны парламент.

— Я беларус, — гаворыць кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тав. Сеўко Павел Антонавіч, — я дзякую вам за аказанае мне давер'е. Я запэўніваю ўсіх выбаршчыкаў, што за справу народа, за росквіт сваёй соцыялістычнай радзімы не пашкадую ні сваіх сіл, ні свайго здароўя.

Гэта голас усяго беларускага народа, які стагнаў пад прыгнётам польскіх паноў, над якім здзекаваліся і глуміліся толькі за тое, што ён беларус. Цяпер народы заходніх абласцей Беларусі могуць свабодна выбіраць сваіх лепшых сыноў і дачок у соцыялістычны парламент.

— Я паляк, — гаворыць кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Турлейскі Іван Антонавіч, — але я ненавідзеў Польшчу памешчыкаў і капіталістаў. Само стварэнне гэтай ласкутнай дзяржавы было антысовецкай правакацыяй лонданскіх і парыжскіх імперыялістаў. Але дарэмны былі іх стараннi. Польшча пілсудскіх, бекаў і рыдз-сміглых, Польшча памешчыкаў і капіталістаў развалілася, як картачны домік. Я даю слова, — гаворыць тав. Турлейскі, — аддаць усе свае сілы на блага народа, на блага нашай сапраўднай радзімы — СССР.

Гэта голас усіх чэсных працоўных польскай нацыянальнасці, якія разам з беларусамі, яўрэямі і іншымі нацыянальнасцямі, набылі сабе радзіму пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Выбарчая кампанія ўступіла ў самы рашаючы перыяд. Акруговыя выбарчыя камісіі прыступілі да рэгістрацыі кандыдатаў, выстаўленых грамадскімі арганізацыямі, таварыствамі працоўных, агульнымі сходамі рабочых, служачых, інтэлігенцыі і сялян.

Згодна арт. 70 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», кожнай арганізацыі, якая выставіла кандыдата і зарэгістравала яго ў акруговай выбарчай камісіі, роўна як кожнаму грамадзяніну СССР, забяспечваецца права бесперашкоднай агітацыі за гэтага кандыдата на сходах, у друку і іншымі сродкамі.

Гэта найвялікшае права дае магчымасць усім працоўным масам скарыстаць усе сродкі для агітацыі за сваіх кандыдатаў. Трэба ярка і даходліва расказаць выбаршчыкам біяграфіі кандыдатаў, за якіх яны будуць галасаваць. Гэта могуць зрабіць сотні і тысячы людзей, якія блізка ведаюць кандыдатаў, сумесна з імі працуюць.

Вялікая і пачэсная роля нашага большэвіцкага друку. Выходзячыя абласныя газеты на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах, раённыя газеты, а таксама насценныя газеты павінны ў гэтыя дні ўсю сваю ўвагу аддаць агітацыі за кандыдатаў. Побач з біяграфічнымі нарысамі трэба змяшчаць пісьмы і заметкі выбаршчыкаў, якія блізка ведаюць кандыдатаў.

Вялікую ролю павінна адыграць радыё. Ля мікрафона могуць выступіць самі кандыдаты, а таксама выбаршчыкі з агітацыяй за кандыдатаў. Усе сродкі павінны быць скарыстаны, каб ахапіць кожнага выбаршчыка большэвіцкай агітацыяй. Не павінна быць ні аднаго выбаршчыка, які-б не ведаў падрабязную біяграфію кандыдата, за якога ён будзе галасаваць.

Калі пры выбарах у польскі сейм і сенат прадажніцкі друк вымушан быў многа чаго ўтойваць з біяграфіі кандыдатаў, каб не выявіць перад народам сапраўдны твар гэтых эксплаататараў і правакатараў, то нам утойваць зусім няма чаго. Наадварот, няхай кожны ведае, што народ вылучае кандыдатамі ў дэпутаты рабочых, работніц, сялян, сялянак, інтэлігентаў, партыйных і беспартыйных, людзей усіх нацыянальнасцей. Няхай усе ведаюць, што народ вылучае палкіх патрыётаў радзімы, якія гатовы аддаць усе сілы, а калі патрэбна будзе — і жыццё, за справу народа.

Сіла большэвіцкай агітацыі ў яе праўдзе. Шырока разгорнутая большэвіцкая агітацыя, як магутная хваля, змые з свайго шляху варожыя спробы паклёпам і ашуканствам апарочыць кандыдатаў народа. Большэвіцкая агітацыя за кандыдатаў прынясе 24 сакавіка — у дзень выбараў — новую бліскучую перамогу Сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных.

«о»

НАГРАЖДЕНИЕ ЗОЛОТЫМИ МЕДАЛЯМИ УЧАСТНИКОВ ВСЕСОЮЗНОЙ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ ВЫСТАВКИ

В соответствии с постановлением Совета Народных Комиссаров Союза СССР и Центрального Комитета ВКП(б) «О Всесоюзной сельскохозяйственной выставке» от 17 февраля 1939 года Главный комитет Всесоюзной сельскохозяйственной выставки наградил золотыми медалями участников ее, показавших лучшие образцы работы,— председателей колхозов, директоров машинотракторных станций и совхозов, специалистов, передовиков и организаторов сельского хозяйства. Большие золотые медали будут вручены 1000 человек, малые золотые медали—2000 человек.

Награжденные золотыми медалями одновременно получают денежные премии: большой золотой медалью — 3000 рублей, и малой золотой медалью—2000 рублей.

(ТАСС)

НА СЕССИИ ЯПОНСКОГО ПАРЛАМЕНТА

Токио, 21 февраля. (ТАСС). Агентство Домей Цусин сообщает, что сегодня состоялось пленарное заседание бюджетной комиссии японского парламента, которая одобрила проект государственного бюджета в сумме 10 миллиардов иен.

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР І БССР

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ГРОДНЕНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 582.

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР

ПРЫТЫЦКАГА СЯРГЕЯ ОСІПАВІЧА

Разгледзеўшы паступіўшыя ў выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, Акруговая выбарчая камісія ўстанавіла поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», пастанаўляе: ў адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» зарэгістрыраваць для балатыроўкі па Гродненскай выбарчай акрузе № 582 выстаўленую агульнымі сходамі: фанернага завода, на якім прысутнічала 250 чалавек; табачнай фабрыкі, на якім прысутнічала 600 чалавек, і падтрыманая акруговай нарадай упаўнаважаных, на якой прысутнічала 233 чалавека, — кандыдатуру тав. ПРЫТЫЦКАГА СЯРГЕЯ ОСІПАВІЧА, 1913 года нараджэння, беспартыйнага, намесніка старшыні аблвыканкома, пражываючага ў г. Беластоку.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», уключыць кандыдатуру Прытыцкага Сяргея Осіпавіча ў выбарчы бюлетэнь па Гродненскай выбарчай акрузе № 582 па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

На падставе арт. 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня Акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей
ТАРАСАЎ

Намеснік старшыні
ОСІПАВА

Сакратар
ФАНДЫШЭВІЧ

Члены камісіі:
СМАРЖКО, ЗІНОЎКА, ВАРАБ'ЁЎ

21 лютага 1940 г.
г. Гродно.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ БЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 598

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

ДЗ'ЯЧУК МАРЫІ ІВАНАЎНЫ

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», п а с т а н а ў л я е:

У адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Бельскай выбарчай акрузе № 598 вылучаную агульным сходам рабочых кафельнага завода м. Орля, Бельскага раёна; сходам сялян вёсак Касеркаўскага сельсовета, Цеханавецкага раёна; сходам рабочых і служачых гарадскога пасёлка Бранск, Бранскага раёна; сходам вёсак Цяцеркі, Нагуркі, Клімашы, Прушкі, Замброўскага раёна; сходам рабочых і служачых м. Зарэмбы, Чыжаўскага раёна, на якіх прысутнічала 1156 чалавек, і сходамі сялян і рабочых Лапскага раёна, падтрыманую на акруговым прадвыбарчым сходзе, на якім прысутнічала 211 чалавек кандыдатуру тав. ДЗ'ЯЧУК МАРЫІ ІВАНАЎНЫ, 1902 года нараджэння, пражываючую ў гор. Беластоку, беспартыйную, працуе заг. Бюро скарг Беластоцкага аблвыканкома.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», уключыць кандыдатуру тав. Дз'ячук Марыі Іванаўны ў выбарчы бюлетэнь па Беластоцкай выбарчай акрузе № 598 па выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

На падставе арт. 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза
МІРОНЧЫК

Намеснік старшыні
САВІЦКІ

Сакратар
ЗЛАТКЕВІЧ

Члены:
РУСАК, РОХМАН, САНЕЎСКІ, КІРЫЛЮК і МІНКЕВІЧ.

г. Бельск, 20 лютага.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ РУДКОЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 337

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

БЯЛАГА ПАЎЛА ІВАНАВІЧА

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанаўляе:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Рудкоўскай выбарчай акрузе № 337 вылучаную агульным сходам выбаршчыкаў сялян і інтэлігенцыі Колакскага сельсовета, на якім прысутнічала 150 чалавек, падтрыманую агульным сходам выбаршчыкаў м. Рудкі, на якім прысутнічала 200 чалавек, і акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 170 чалавек, кандыдатуру тав. БЯЛАГА ПАЎЛА ІВАНАВІЧА, 1903 года нараджэння, пражываючага ў вёсцы Колакі-Косцельна, Колакскага сельсовета, Замброўскага раёна, беспартыйнага, селяніна-бедняка, паляка па нацыянальнасці.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Бялага Паўла Іванавіча ў выбарчы бюлетэнь па Рудкоўскай выбарчай акрузе № 337.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР
Е. ЗАЛЕСКІ

Намеснік старшыні
В. ВАЙЦЭХОВІЧ

Сакратар
І. ГАРШКОЎ

Члены:
ХЛЕСТКІН, БЕЛЯЎСКІ, ЧАРНОЦКАЯ, СІНКЕВІЧ, ВЕЖБА, ГРАБОЎСКІ.

Рудкі, 20 лютага 1940 г.

З В А Р О Т

Да ўсіх выбаршчыкаў Беластоцкай Выбарчай Акругі № 581 па выбарам у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР

Таварышы выбаршчыкі! Чырвоная Армія, верная свайму інтэрнацыянальнаму доўгу, прынесла мільёнам людзей вызваленне ад капіталістычнага рабства і нацыянальнага прыгнечання. Вялікі Совецкі Саюз прыняў народы заходніх абласцей Беларусі ў сваю дружную сям'ю, зрабіў нас паўнапраўнымі грамадзянамі вялікай непераможнай краіны соцыялізма і прадаставіў нам вялікія правы Сталінскай Канстытуцыі.

Сталінская Канстытуцыя адкрыла для нас новую эру разгорнутага соцыялістычнага дэмакратызма. Яна з'яўляецца магутнай крыніцай совецкага патрыятызма і бурнага ўздыму палітычнай актыўнасці народаў СССР..

З небывалым уздымам і захапленнем праходзілі прадвыбарчыя сходы працоўных, прысвечаныя вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР. З выражэннем найвялікшай радасці рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя на сходах называлі першым сваім кандыдатам любімага ўсімі правадыра працоўных усяго свету вялікага Сталіна і яго баявых саратнікаў.

На гэтых сходах з усёй веліччу ўскрылася бязмежная любоў народа да слаўнай комуністычнай партыі і яе правадыра, безгранічная адданасць працоўных сваёй соцыялістычнай радзіме.

Кандыдатамі ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР на сходах працоўных вылучаны лепшыя сыны і дочкі вызваленага народа. Яны дастойны быць кандыдатамі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Сабраўшыся на акруговую прадвыбарчую нараду, мы рашылі падтрымаць вылучаную радам агульных сходаў рабочых, сялян і інтэлігенцыі, кандыдатуру Івана Антонавіча Турлейскага.

Мы звяртаемся да ўсіх выбаршчыкаў 581 выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР прыняць самы актыўны ўдзел у выбарах. 24 сакавіка 1940 года ўсе, як адзін, з'явімся на выбарчыя ўчасткі і аддадзім свае галасы за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных тав. Турлейскага Івана Антонавіча.

Галасуючы за тав. Турлейскага, мы будзем галасаваць за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за тав. Турлейскага, мы будзем галасаваць за вернага сына беларускага народа.

Галасуючы за тав. Турлейскага, мы прагаласуем за партыю большэвікоў, за Сталінскую Канстытуцыю, за шчаслівае жыццё ў краіне соцыялізма і радасную будучыню.

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве Совецкая ўлада!

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве наш друг і настаўнік вялікі СТАЛІН!

АКРУГОВЫЯ ПРАДВЫБАРЧЫЯ НАРАДЫ

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 599 АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Ігаева Сямёна Сцяпанавіча

Ломжа. (Наш спецкор). 200 чалавек упаўнаважаных ад выбаршчыкаў Ломжынскага, Граеўскага, Едвабнаўскага і Снядоўскага раёнаў сабраліся 20 лютага на акруговую прадвыбарчую нараду 599 выбарчай акругі.

Пад бурныя апладысменты выбіраецца ганаровы прэзідыум на чале з вялікім Сталіным. Пасля даклада сакратара Ломжынскага райкома КП(б)Б тав. Анісімава аб прадстаячых выбарах выступіў Вырвас Міхаіл.

— Я першы раз у сваім жыцці маю магчымасць удзельнічаць у выбарах вярхоўнай улады. Ці патрэбна даказваць аб той велізарнай розніцы паміж выбарамі ў краіне соцыялізма і ў панскай Польшчы, дзе ў выбарах удзельнічала адна трэць насельніцтва і ўсе галасавалі пад націскам бізуна. Зусім інакш зараз. Мы самі вылучаем сапраўды народных кандыдатаў.

Мы вылучылі тав. Ігаева Сямёна Сцяпанавіча кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР. Ён заслугоўвае быць нашым выбраннікам, таму што тав. Ігаеў выхадзец з працоўнага народа, якому ён верна служыць і аддае ўсе свае сілы і ўмацаванне совецкай улады ў заходніх абласцях Беларускай ССР.

На нарадзе выступіў тав. Ігаеў:

— Я ад усёй душы шчыра дзякую працоўных Ломжынскай выбарчай акругі за аказанае мне давер'е і прыкладу ўсе свае сілы і энергію для таго, каб апраўдаць ваша давер'е. Усе свае заслугі я аддаю нашай партыі Леніна-Сталіна, выхавальнікам якой я з'яўляюся.

Па нацыянальнасці я мардвін. З малых год пачаў хадзіць па наймах, у 1921 годзе ўступіў у рады ленінска - сталінскага комсамола, а ў 1926 г.— у комуністычную партыю. Ужо некалькі год як я працую на кіруючай партыйнай рабоце. Я заўсёды быў верны народу, совецкай уладзе і комуністычнай партыі. Калі ўдастоюся чэсці быць вашым дэпутатам, заяўляю, што буду адстайваць вашы інтарэсы, я выканаю ўказанні таварыша Сталіна, буду слугой народа, да канца адданы яму.

Нарада прыняла зварот, у якім прызывае ўсіх выбаршчыкаў 599 акругі ў дзень выбараў аддаць свае галасы за кандыдата сталінскага блока—за тав. Ігаева. Галасуючы за тав. Ігаева,—гаворыцца ў звароце—мы будзем галасаваць за далейшае ўмацаванне совецкай улады ў заходніх абласцях БССР.

М. Шахновіч

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 354 АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча

У памяшканні абласнога Дома партасветы г. Беластока 20 лютага адбылася прадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных Совецкай выбарчай акругі № 354. На нарадзе прысутнічала 586 чалавек.

Слова атрымлівае тав. Стэц С. К.

— Настаўнікі г. Беластока і шматлікія сходы рабочых і інтэлігенцыі,—гаворыць ён, — вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча. Тав. Машэвіцкага за яго сумленнасць і вялікую работу па выхаванню маладога пакалення любіць уся грамадскасць горада. Ён лепшы сын народа, адданы да канца свайй соцыялістычнай радзіме. Спадзяюся, што наша нарада аднадушна падтрымае гэту кандыдатуру.

У сваіх выступленнях тав. Зайдлер, Сарокін, Райфер і інш. аднадушна падтрымалі прапанову тав. Стэц.

На трыбуне тав. Машэвіцкі.

— Усё сваё свядомае жыццё, — гаворыць тав. Машэвіцкі, — я прысвяціў працоўнаму народу. На працягу 24-гадовай работы настаўніка я выхоўваў моладзь беднага яўрэйскага насельніцтва. Не мог я мірыцца і не мірыўся з нянавісным польскім ладам. Мяне цягнула да свабоднага жыцця. І таму я знаёміў сваіх слухачоў з светлым і радасным жыццём у краіне соцыялізма пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Пасля вызвалення нас з-пад панскага прыгнёту я аддаю свае намаганні справе соцыялістычнага будаўніцтва. Выбаршчыкі аказваюць мне вялікую чэсць, вылучаючы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Заяўляю выбаршчыкам, што іх надзеі і жаданні я з чэсцю выканаю.

У сваёй пастанове нарада запісала:

„Прадвыбарчая нарада Совецкай акругі № 354 (г. Беласток) **аднадушна** падтрымлівае кандыдатуру тав. Машэвіцкага.

Нарада абавязалася ўвесці агітацыю за тав. Машэвіцкага, дастойнага кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Удзельнікі нарады заклікалі ўсіх выбаршчыкаў прыняць актыўны ўдзел у галасаванні за тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча.

Д. Казлоў.

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 600 АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВЫ АГУЛЬНЫХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Пестрака Філіпа Сямёнавіча

Гродна. (Па тэлефону). 19 лютага ў памяшканні гродненскага тэатра адбылася нарада ўпаўнаважаных ад усіх раёнаў, уваходзячых у 600 выбарчую акругу.

У зале прысутнічаюць 200 чалавек прадстаўнікоў прадпрыемстваў, вёсак і грамадскіх арганізацый гарадоў Гродна, Аўгустова і раёнаў Гродненскага, Парэцкага, Дамброўскага і інш.

Нараду адкрывае сакратар гаркома КП(б)Б тав. Пазнякоў, які ва ўступнай прамове расказаў прысутным аб дасягненнях вызваленых народаў заходніх абласцей за 5 месяцаў совецкай улады.

На трыбуну паднімаецца ўпаўнаважаны ад настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ гор. Гродна тав. Лосеў. Ён прапануе падтрымаць прапанову калектыва настаўнікаў гор. Гродна і другіх агульных сходаў аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Пестрака Філіпа Сямёнавіча. Тав. Пестрак, — гаворыць тав. Лосеў, — на працягу ўсяго свайго жыцця вёў актыўную барацьбу з эксплаататарамі. Сваімі вершамі і рэволюцыйнай дзейнасцю ён падымаў народ супроць памешчыкаў і капіталістаў.

Выступаўшыя за тав. Лосевым упаўнаважаныя выразілі волю сваіх калектываў і аднадушна падтрымалі кандыдатуру тав. Пестрака.

Нарада ўпаўнаважаных аднадушна вылучыла тав. Пестрака кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Нарада выбрала даверaных у колькасці 9 чалавек, якім паручана весці агітацыю сярод выбаршчыкаў 600 выбарчай акругі за свайго кандыдата, каб у гістарычны дзень 24 сакавіка дабіцца 100-процантнай яўкі выбаршчыкаў на выбарчыя ўчасткі і галасавання за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных Пестрака Філіпа Сямёнавіча. **Чэрнухін.**

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ СЛАБОДСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 355 АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Прохарава Нікалая Іванавіча

20 лютага ў зале кінотэатра „Чырвоная зорка" адбылася прадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных № 355 Слабодскай выбарчай акругі г. Беластока па абмеркаванню кандыдатуры ў Вярхоўны Совет БССР. На нараду з'явілася 350 чалавек.

Пад незмаўкаючыя апладысменты прысутныя выбралі ў ганаровы прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З вялікай увагай была выслухана інфармацыя сакратара гаркома КП(б)Б тав. Сяргеева аб выбарах.

Адзін за другім выступалі ўдзельнікі і гарачымі, поўнымі энтузіязма словамі падтрымлівалі рашэнні сходаў рабочых, інжынераў і служачых прадпрыемстваў і фабрык гор. Беластока, вылучыўшых кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Прохарава Нікалая Іванавіча.

— Упершыню ў гісторыі працоўныя горада Беластока будуць выбіраць сапраўды народных прадстаўнікоў у вярхоўныя органы совецкай улады,—гаворыць тав. Бабравіцкі.—20 год мы цярпелі голад і беспрацоўе, мы гінулі пад прыгнётам памешчыкаў і капіталістаў.

Цяпер толькі, дзякуючы адзінай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, мы атрымалі поўныя правы і палітычную свабоду, мы сталі раўнапраўнымі грамадзянамі Совецкага Саюза.

— Мы павінны панесці ў масы наша бальшэвіцкае слова, — гаворыць т. Пік,—растлумачыць усім выбаршчыкам Палажэнне аб выбарах, агітаваць за кандыдатаў, а тым самым за совецкую ўладу, за соцыялізм.

У прынятай пастанове нарада падтрымлівае кандыдатуру Нікалая Іванавіча Прохарава і заклікае аднагалосна ўсіх выбаршчыкаў 355 Слабодскай выбарчай акругі з'явіцца 24 сакавіка на выбарчыя ўчасткі і аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Нарада аднадушна пад бурныя апладысменты прыняла прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну. Нарада выбрала даверaных, якім будзе даручана агітацыя сярод выбаршчыкаў за кандыдатуру тав. Прохарава.

Л. Рудзік.



ЗАВТРА ВСЯ СТРАНА БУДЕТ ПРАЗДНОВАТЬ XXII ГОДОВЩИНУ РККА

НЕЗАБЫВАЕМАЯ ВСТРЕЧА

17 сентября утром наши соседи услышали по радио речь тов. Молотова. Весть, что Красная Армия перешла границу и идет на помощь народам Западной Белоруссии и Западной Украины, облетела все местечко Михайлово. Несколько радиоприемников, которые находились в Михайлове, работали с утра до вечера. Мы устраивали около них дежурства, чтобы не пропустить ни одной весточки, ни одного слова с той стороны бывшей границы.

А граница все подвигалась вперед. С радостным волнением мы узнавали путь, проделанный Красной Армией, мы искали на карте названий освобожденных городов и деревень. Мы завидовали каждому находящемуся там человеку. Наше нетерпение и ожидание росло со дня в день.

Прошло два дня—18 и 19 сентября. Вдруг в местечке распространился слух, что будто бы Красная Армия не пойдет дальше Волковыска. В течение часа уложили все вещи в мешки и были готовы к дороге, чтобы перебраться на сторону красных. Мы установили дежурства по дороге в Городок, готовые в поход при каждом новом известии.

20 сентября утром на дороге, ведущей из Городка, показался первый советский грузовик, за ним второй, третий, десятый. Дорога заполнилась сотнями красноармейских грузовиков.

Трудно выразить словами радость и волнение, которое нас охватило. Старые и молодые, взрослые и дети — весь народ вышел на улицу встречать своих освободителей. Улицы местечка загорелись красным цветом. Дети и женщины забрасывали бойцов цветами.

Мы окружили бойцов, давали им вопросы:

— А как у вас живут женщины-работницы?

— Разве это правда, что все дети учатся в школах бесплатно?

Красноармейцы спокойно с улыбкой отвечали на все вопросы.

Все новые и новые части пехоты и артиллерии шли по шоссе. Всех их встречала та же радость, те же горячие лозунги. Мы гуляли по улицам до поздней ночи. Слышно радостное „Да здравствует Красная Армия". Эти сильные, горячие голоса бросали в темную ночь свой пламенный зов новой жизни.

Этой ночью я уснуть не могла. Я думала о светлом, лучезарном будущем, которое для всех нас, трудящихся, сейчас наступило. XXII годовщина Красной Армии—это праздник для всех нас, свободных граждан великого Советского Союза.

С. Рафалович,
работница 5 комбината.

В обстановке братской дружбы

На-днях в зале пединститута состоялось собрание рабочих комбината № 4 и текстильной фабрики № 11, посвященное XXII годовщине РККА. На собрание прибыли рабочие и инженерно-технические работники и также представители Красной Армии—бойцы и командиры.

Тов. Кунцевич рассказал собравшимся о героической истории Красной Армии, о ее победоносной борьбе против интервентов, о ее силе и могуществе. С глубоким волнением присутствующие рабочие слушали слова оратора о мужественных подвигах Красной Армии в борьбе за освобождение Западной Белоруссии и Западной Украины и о фактах беспримерного геройства бойцов и командиров в боях с белофиннами. В зале раздавались лозунги и приветствия в честь нашей освободительницы Рабоче - Крестьянской Красной Армии.

Собрание единогласно решило послать приветствие товарищу Сталину—организатору Красной Армии, вождю народов СССР.

После собрания состоялся концерт, выступления драмкружка текстильного комбината № 4 и художественного ансамбля Красной Армии. Кроме того, была показана кино-картина „Балтийцы". Вечер прошел в обстановке братской дружбы рабочих и их освободителей — бойцов и командиров РККА.

И. А. Малиняк,
чертежник 4-го текстильного комбината.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

НА СХОДЗЕ СЯЛЯН АСТРОЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, ЗАБЛУДАЎСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Захараў Міхаіл Грыгор'евіч

(На сходзе прысутнічала 300 чалавек)

Сход сялян Астроўскага сельсовета, Заблудаўскага раёна, па прапанове селяніна Барташэвіча аднадушна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Захарава Міхаіла Грыгор'евіча, 1899 года нараджэння, члена ВКП(б), паходзячага з сялян-беднякоў, зараз працуючага ўпаўнаважаным Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР.

Сход просіць тав. Захарава даць згоду балатавацца па 348 выбарчай акрузе.

НА СХОДЗЕ СЯЛЯН МІХАЙЛАЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА І РАБОЧЫХ ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА № 9 ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Максімлюк Еўдакія Фёдараўна

(На сходзе прысутнічала 700 чалавек)

На агульным сходзе сялян Міхайлаўскага сельсовета, Заблудаўскага раёна, сумесна з рабочымі тэкстыльнага камбіната № 9 аднадушна вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Максімлюк Еўдакія Фёдараўна.

Тав. Максімлюк 1901 года нараджэння, сялянка-беднячка, беларуска па нацыянальнасці, беспартыйная, арганізатар і старшыня калгаса імені Сталіна.

Сход просіць тав. Максімлюк даць згоду балатавацца па 349 выбарчай акрузе.

СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ КАБЫЛЬНІКІ, ЦЕХАНАВЕЦКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Кардзіяка Іван Аляксеевіч

(На сходзе прысутнічала 170 чалавек)

Сяляне вёскі Кабыльнікі, Цеханавецкага раёна, з вялікім уздымам правялі сход, на якім аднадушна рашылі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Кардзіяка Івана Аляксеевіча, першага сакратара Цеханавецкага райкома КП(б)Б, 1902 года нараджэння, беларуса, з сялян-беднякоў.

Сход просіць тав. Кардзіяка даць сваю згоду балатавацца па 340 выбарчай акрузе.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ ПАРАВОЗА - ВАГОНАРАМОНТНАГА ЗАВОДА СТ. ЛАПЫ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Банась-Банасюк Адольф Станіслававіч

Сход рабочых і служачых паравоза вагонарамонтнага завода ст. Лапы вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Банась—Банасюка.

Тав. Банась-Банасюк нарадзіўся ў 1889 годзе. 12 год ён працаваў батраком. Ён правадзіў рэволюцыйную работу, змагаўся за справу рабочага класа.

Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Банась-Банасюка і просіць яго даць сваю згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 346.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТАМ

УТВАРЭННЕ І ГЕРАІЧНАЯ АБАРОНА БЕЛАРУСКАЙ ССР

(Працяг. Пачатак у № 41 і 42)

Карыстаючыся тым, што галоўныя сілы Чырвонай Арміі былі кінуты супроць Калчака, што з поўдня ўзмацніўся націск дзенікінскіх полчышч, а пад Петраградам ішла ўпорная барацьба з Юдзенічам, Польшча, па ўказцы англійскага і французскага ўрадаў, узмацніла баявыя дзеянні супроць БССР.

У гэты напружаны момант у ліпені 1919 г. на заходні фронт прыбывае тав. Сталін. Ён прыехаў сюды зараз-жа пасля таго як пад яго кіраўніцтвам Юдзеніч, белафіны і англійскі флот былі адкінуты ад Петраграда і быў падаўлен мяцеж на фортах «Красная горка» і «Серая Лошадь». Баявы саратнік Сталіна К. Е. Варашылаў піша: «У перыяд 1918—1920 гг. таварыш Сталін з'яўляўся, бадай, адзіным чалавекам, якога Цэнтральны камітэт кідаў з аднаго баявога фронта на другі, выбіраючы найбольш небяспечныя, найбольш страшныя для рэвалюцыі месцы. Там, дзе было адносна спакойна і добра, дзе мы мелі поспехі,—там не было відаць Сталіна. Але там, дзе ў сілу цэлага раду прычын трашчалі чырвоныя арміі, дзе контррэвалюцыйныя сілы, развіваючы свае поспехі, пагражалі самому існаванню совецкай улады, дзе замяшанне і паніка маглі ў любую мінуту ператварыцца ў бездапаможнасць, катастрофу,—там паяўляўся таварыш Сталін. Ён не спаў начэй, ён арганізоўваў, ён браў у свае цвёрдыя рукі кіраўніцтва, ён ламаў, быў бязлітасны—ствараў пералом, аздараўляў абстаноўку». (Варашылаў К., «Сталін і Чырвоная Армія», стар. 4, М. 1937г.).

Прыбыўшы ў Смаленск, дзе знаходзіўся ў той час штаб заходняга фронта, таварыш Сталін неадкладна заняўся дэтальным вывучэннем становішча на фронце. Заходні фронт к гэтаму часу цягнуўся ад Мурманска на поўдзень да Мозыра звыш чым на 1.600 кілометраў. Рад баявых участкаў ахоўваўся толькі асобнымі дробнымі самастойнымі атрадамі: аршанскім, гомельскім, барысаўскім і іншым.

Сілы Чырвонай Арміі, перанёсшай усе труднасці зімовай кампаніі 1918—1919 гг., к лету значна аслаблі. У палках дывізій у сярэднім было ад 400 да 600 штыкоў, у батальёне—ад 100 да 200.

Тонкай цэпачкай цягнуліся часці Чырвонай Арміі ўздоўж фронта. Камандаванне не праявіла патрэбнага ўмення манеўраваць малымі сіламі і сродкамі, якое яно мела на фронце. Мясцовыя рэсурсы не скарыстоўваліся ў поўнай меры, учоту іх не было, а галоўнае — не адчувалася моцнага палітычнага кіраўніцтва і адпаведнай арганізацыі абароны. Камандуючы фронтам— былы генерал царскай арміі — быў зусім непрыгодны, як кіраўнік і арганізатар рэвалюцыйнага фронта. Цяжка сказвалася таксама дзеянне скрытай варожай рукі. Здраднік Троцкі даваў распараджэнні, якія садзейнічалі аслабленню сіл Чырвонай Арміі на заходнім фронце. Галоўнае камандаванне бяздзейнічала.

Становішча на фронце стварылася цяжкае. Маральнае становішча некаторых часцей было нездавальняючае. Існавала вялікая блытаніна ў дыслакацыі часцей: часці адной дывізіі аказваліся перамешанымі з часцямі другой, часам часці адной арміі аказваліся ў другой.

На першым-жа пасяджэнні Рэўваенсовета ў Смаленску таварыш Сталін паставіў перад камандуючым рад пытанняў: чаму не наладжана фарміраванне папаўненняў? чаму расцягнуты часці па фронту? Гэтыя пытанні выклікалі ў камандуючага фронта трывогу: ён часта не ведаў, што адказаць. На гэтым пасяджэнні былі намечаны шляхі да вырашэння задач, з якімі камандуючы фронтам і штаб фронта не маглі справіцца на працягу многіх тыдняў.

Праз некалькі дзён быў назначан новы камандуючы фронтам. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна фронт быў аздароўлен. Часці былі перагрупіраваны і вернуты ў свае брыгады і дывізіі.

Рэўваенсовет ішоў на гераічныя меры. Брыгады адводзіліся ў тыл, часам глыбокі, як напрыклад, у Вязьму. Іх знімалі з фронта, каб папоўніць, прывесці ў парадак, абучыць, абмундзіраваць, а затым вярнуць на фронт умацаванымі і дысцыплінаванымі. Часці, панёсшыя вялікія страты і нябоездольныя, расфарміроўваліся, іх састаў, узбраенне і снаражэнне ішлі на ўмацаванне іншых часцей. Так напрыклад, загадам ад 20 жніўня былі расфарміраваны шэсць каравульных батальёнаў і тры роты.

Створаная Рэўваенсоветам фронта сістэма папаўнення арміі людскім саставам, матэрыяльнай часткай і ўзбраеннем была аснавана на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў франтавой паласы, на ўмелым манеўрыраванні наяўнымі сіламі. Гэта была сістэма, высунутая самой рэвалюцыяй.

Рэўваенсовет стварыў Упраўленне фарміраванняў рэзервных і запасных войск — Упраформзап.

